Журнал международного права и международных отношений. 2023. № 1 (104). С. 25—30.
Journal of International Law and International Relations. 2023. N 1 (104). P. 25—30.
УДК 94(476)«1921/1923» DOI: 10.33581/2072-0513-2023-1-25-30

# ПРАЦЭС АПТАЦЫІ ПОЛЬСКАГА ГРАМАДЗЯНСТВА НА ТЭРЫТОРЫІ БССР У 1921—1923 гг.

**Вольга Бароўская**

*Разгледжана праблема аптацыі польскага грамадзянства на тэрыторыі Беларусі ў 1921—1923 гг. Пытанне аптацыі паўстала яшчэ падчас працы Рыжскай мірнай канферэнцыі. Распрацоўка палажэнняў і правілаў аптацыі адбывалася ў рамках юрыдычна-прававой камісіі ў студзені—лютым 1921 г. Апціраваць польскае грамадзянства можна было па факту нараджэння і рэгістрацыі на тэрыторыі Царства Польскага. Працэс аптацыі польскага грамадзянства на тэрыторыі Беларусі суправаджаўся праблемамі з пошукамі неабходных дакументальных доказаў сваёй прыналежнасці да польскай нацыянальнасці. За часы ваенных ліхалеццяў значная частка крыніц была пашкоджана, або зусім знікла.*

*Ключавыя словы: аптацыя; грамадзянства; Змешаная камісія па рэпатрыяцыі; пашпарт; Рыжскі мір.*

***«The Process of Opting for Polish Citizenship on the Territory of the BSSR in 1921—1923» (Volga Borovskaya)***

*The problem of the option of Polish citizenship in 1921—1923 on the territory of Belarus is considered. The question of option arose during the Riga Peace Conference. The development of the provisions and rules of option took place within the framework of the legal commission in January—February 1921. It was possible to opt for Polish citizenship by the fact of birth and registration in the territory of the Kingdom of Poland. The process of opting for Polish citizenship on the territory of Belarus was accompanied by problems in finding the necessary documentary evidence of their belonging to the Polish nationality. During the years of war hard times, a significant part of the sources was damaged or completely disappeared.*

*Keywords: citizenship; Mixed Repatriation Commission; option; passport; Riga Treaty.*

Гістарыяграфія савецка-польскіх адносін міжваеннага перыяду пачалася яшчэ ў 1920-я гг., калі з'явіліся першыя працы па гэтай праблеме [4; 8]. У 1960-я гг. былі ўведзены ў навуковы ўжытак новыя крыніцы па гісторыі польска-савецкай вайны 1919—1920 гг. П. Н. Альшанскі, паважаючы ацэнкі 1950-х гг., прывёў раней невядомыя матэрыялы аб ваенных дзеяннях і палітычным баку савецка-польскіх адносін 1918—1921 гг., а таксама аб пазіцыі краін Антанты, якія ўлічвалі пры вырашэнні пытання ўсходняй польскай мяжы этнаграфічныя і эканоміка-геаграфічныя фактары [6]. Менавіта гэтым аўтарам была ўпершыню даследавана праблема аптацыі польскага грамадзянства.

Польскія гісторыкі, якія працавалі ў часы існавання Польскай Народнай Рэспублікі, у сваіх ацэнках развіцця савецка-польскіх адносін паўтаралі высновы савецкай гістарыяграфіі. Такія даследчыкі, як В. Гастынская [10], Е. Куманецкі [11], В. Матэрскі [12], пісалі аб характары савецка-польскіх адносін пасля стварэння Польскай дзяржавы, аб выніках польска-савецкай вайны 1919—1920 гг., тэрытарыяльных праблемах, якія ўзніклі і па віне польскага боку. Польскія гісторыкі неаднаразова звярталі ўвагу на негатыўныя моманты аптацыі: адсутнасць дакументальных доказаў і прымусовасць савецкіх уладаў [11; 12].

З сучасных даследаванняў варта ўзгадаць працы А. М. Бабкова [1], Е. А. Кірылавай [3], Л. К. Астроўскага [7]. Аднак гістарыяграфічны агляд паказвае недастатковую вывучанасць пытання, неабходнасць увядзення ў навуковы зварот новых архіўных матэрыялаў, раней недаступных даследчыкам. Мэта артыкула — выявіць асаблівасці працэсу аптацыі польскага грамадзянства на тэрыторыі БССР у 1921—1923 гг.

Даследаванне ажыццяўлялася пры выкарыстанні спецыяльных гістарычных метадаў, прынцыпаў гістарызму і аб'ектыўнасці. Упершыню ўводзяцца ў навуковы ўжытак нарма-

*Аўтар:*
**Бароўская Вольга Мікалаеўна** — кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра ўсеагульнай гісторыі, міжнародных адносін і геапалітыкі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, *e-mail: borovskaya-olga@mail.ru*
*Інстытут гісторыі НАН Беларусі. Адрес: 1, вул. Акадэмічная, 1, Мінск, 220072, БЕЛАРУСЬ*

*Author:*
**Borovskaya Volga** — Candidate of History, Senior Researches of the Institute of History, National Academy of Sciences of Belarus, *e-mail: borovskaya-olga@mail.ru*
*Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus. Address: 1, Akademicheskaya str., Minsk, 220072, BELARUS*

тыўныя прававыя дакументы Народнага камісарыята ўнутраных спраў БССР (ССРБ), якія ўстанаўлівалі правілы і механізмы ажыццяўлення аптацыі польскага грамадзянства. Рэканструкцыя працэсу адбываецца пры выкарыстанні архіўных і апублікаваных крыніц.

Праблема аптацыі польскага грамадзянства паўстала яшчэ падчас працы Рыжскай мірнай канферэнцыі ў верасні 1920 г. — сакавіку 1921 г. Распрацоўка палажэнняў і правілаў аптацыі адбывалася ў рамках юрыдычна-прававой камісіі ў студзені—лютым 1921 г. Было праведзена абмеркаванне праблемы прадстаўлення права аптацыі насельніцтву, якое апынулася на тэрыторыі БССР (ССРБ), УССР і РСФСР і лічыла сябе палякамі па нацыянальнасці. Праблемным момантам стаў працэс вызначэння той катэгорыі асоб, якой будзе дазволена выкарыстаць азначанае права. За кропку адліку быў прыняты 1914 г.: мясцовае насельніцтва, якое пастаянна пражывала на тэрыторыі былога Царства Польскага, мела права выбраць для пастаяннага месцажыхарства тэрыторыю Польшчы. Польская частка камісіі настойвала на распаўсюджванні права аптацыі на насельніцтва з так званым «польскім паходжаннем», якое ў першым пакаленні па бацькавай або мацярынскай лініі лічыла сябе палякамі [9, Zespół 1741. Akta R. Knolla, Sygn. 2, s. 79—82].

13 студзеня 1921 г. на пасяджэнні юрыдычна-прававой камісіі Р. Кноль узняў праблему вызначэння ўкраінскага, беларускага, расійскага грамадзянства і пытанне тэрытарыяльнага размежавання паміж украінскімі, беларускімі і расійскімі землямі. Польскі прадстаўнік разглядаў дэфініцыю грамадзянства як устойлівую палітыка-прававую сувязь чалавека і дзяржавы, якая выражаецца ў іх узаемных правах і абавязках і з'яўляецца тэрытарыяльнай характарыстыкай. Узнятыя пытанні былі расцэнены расійска-ўкраінскай дэлегацыяй як спроба замарудзіць ход працы камісіі. Савецкія прадстаўнікі (І. І. Лоранц, Я. С. Ганецкі) не маглі даць дакладных адказаў на пытанні, адводзілі ўсе польскія прэтэнзіі «рашэннямі беларускага з'езду Саветаў» (ІІ Усебеларускі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў 13—17 снежня 1920 г.), які афіцыйна пацвердзіў перадачу беларускіх паўнамоцтваў на вядзенне перагавораў з Польскай дзяржавай РСФСР і дакладна вызначыў дзяржаўную тэрыторыю БССР (ССРБ). Пытанне тэрытарыяльнага размежавання паміж расійскай, украінскай і беларускай тэрыторыямі было перададзена для больш грунтоўнага вывучэння да тэрытарыяльнай камісіі мірнай канферэнцыі [9, Zespół 322. Ministerstwo spraw zagranicznych. Sygn. 6738a, s. 146—152]. Складанасці, якія з'явіліся падчас пасяджэнняў юрыдычна-прававой камісіі, вынікалі з апеляцый членаў польскай дэлегацыі да артыкула І Прэлімінарнага мірнага дагавора, які прызнаваў незалежнасць Беларусі і ўводзіў яе ў склад юрыдычна-прававых суб'ектаў. У сваю чаргу расійска-ўкраінскі бок не збіраўся ісці далей простага афіцыйнага і юрыдычнага прызнання незалежнасці, якое было хутчэй геаграфічным, чым дзяржаўна-палітычным.

Канчаткова справа аптацыі была вырашана на пасяджэнні 16 лютага 1921 г., пры непасрэдным удзеле старшыні расійска-ўкраінскай дэлегацыі А. А. Іофе. У выніку права аптацыі распаўсюджвалася на асоб, якія пастаянна пражывалі на тэрыторыі былога Царства Польскага і былі запісаны ў тыповыя рэгістрацыйныя кнігі [9, Zespół 322. Ministerstwo spraw zagranicznych. Sygn. 6738a, s. 160—163].

Атаясамленне катэгорый «беларускі» і «расійскі» прыводзіла да знікнення дэфініцыі «беларускае грамадзянства» (арт. VI Рыжскага мірнага дагавора), фактычна забараняла асобам польскай нацыянальнасці, якія пражывалі на тэрыторыі Беларусі, карыстацца правам аптацыі. Польскі праект вызначэння катэгорый асоб, якія мелі магчымасць аптавацца («асобы польскага паходжання, якія мелі аднаго з продкаў па мацярынскай або бацькаўскай лініі, што пастаянна пражывалі на тэрыторыі былога Царства Польскага»), быў пазбаўлены канкрэтызацыі і дазваляў уключыць у гэты спіс асоб, якія пражывалі на беларускіх землях [2, с. 624].

Рыжскі мірны дагавор ад 18 сакавіка 1921 г. паміж РСФСР і УССР, з аднаго боку, і Польшчай — з другога, урэгуляваў пытанне аб аптантах паміж гэтымі краінамі. Апціраваць польскае грамадзянства можна было па факту нараджэння і рэгістрацыі на тэрыторыі Царства Польскага (асобы, «якія прыпісаны ці маюць права быць прыпісанымі да кніг сталага народанасельніцтва былога Царства Польскага, а таксама тыя, якія прыпісаны да адной з гарадскіх, сельскіх ці саслоўных грамад на тэрыторыі былой Расійскай імперыі, якая адыходзіла ў склад Польшчы»), а таксама нашчадкам, не далей трэцяга пакалення, тых, хто пастаянна пражываў на яго тэрыторыі. Пры гэтым неабходна было даказаць, «што яны самі сваёй дзейнасцю, выкарыстаннем польскай мовы як размоўнай, выхаваннем сваіх нашчадкаў ясна засведчылі сваю прыхільнасць да польскай нацыі». Так у дагаворы з Польшчай падкрэслівалася важнасць пры аптацыі менавіта нацыянальнай прыкметы [2, с. 625].

Дагавор замацаваў права жонкі і дзяцей накіроўвацца за аптантам. Асобна агаворвалася права аптантаў бесперашкодна выехаць у краіны, у якія яны апціравалі. Акрамя таго, урадам Польшчы, РСФСР і УССР давалася права патрабаваць выезда аптантаў, якія павінны былі ў такім выпадку выехаць на працягу шасці месяцаў пасля таго, як ім пра гэта паведамілі [2, с. 626].

Парадак выканання дагавора ўсталёўваўся пастановамі і інструкцыямі народных камісарыятаў замежных спраў (НКЗС) і ўнутраных спраў (НКУС) БССР (ССРБ), якія вызначалі, што заявы аб аптацыі падаюцца адначасова ў Аддзел упраўлення гарадскіх Саветаў і ў прадстаўніцтва краіны аптацыі на тэрыторыі рэспублікі. Да заявы аб аптацыі неабходна было прыкласці дакументы, якія даказвалі права на аптацыю (від на жыхарства, пашпарт ці метрыка), а таксама звесткі пра сябе і членаў сям'і (узрост, род заняткаў, месца службы і жыхарства) [5, ф. 7, воп. 1, спр. 2, арк. 9]. Аддзел упраўлення павінен быў накіраваць матэрыялы ў НКУС. А той, узгадніўшы пытанне з НКЗС і атрымаўшы згоду з прадстаўніцтва краіны аптацыі аб прыняцці ўказанай асобы ў сваё грамадзянства, дасылаў у аддзел упраўлення аптацыйнае пасведчанне, па якому аптант прызнаваўся грамадзянінам іншай краіны [5, ф. 34, воп. 1, спр. 25, арк. 17].

Асобы, якія выбралі грамадзянства іншай краіны і атрымалі аптацыйныя пасведчанні (від на жыхарства для замежных грамадзян), павінны былі выехаць у сваю краіну на працягу года. Дэкрэт СНК РСФСР ад 29 жніўня 1921 г. «Аб парадку высылкі іншаземцаў з РСФСР» ўстанавіў, што «асобы, якія ў сілу міжнародных дагавораў апціравалі іназемнае грамадзянства і абавязаныя ў пэўны тэрмін выехаць па-за межы рэспублікі», маглі «застацца на працягу тэрміну не інакш, як пры асаблівым дазволе НКУС» [5, ф. 6, воп. 1, спр. 1, арк. 67]. Асобы, якія не выехалі, не падалі хадайніцтва аб такім дазволе і не распачалі справу аб прыняцці іх у савецкае грамадзянства, падлягалі высылцы. Дэкрэтам аптанты былі прыроўнены да іншаземцаў, «спосаб жыцця, дзейнасць і паводзіны» якіх маглі быць «прызнаны несумеснымі з прынцыпамі і ўкладам жыцця рабоча-сялянскай дзяржавы» і якіх на гэтай аснове можна было выслаць па-за межы БССР (ССРБ). Асноўная хваля выезда аптантаў прыходзіцца на 1921—1922 гг. Ад'язджалі не толькі палякі, але і беларусы, рускія, яўрэі і немцы. Аднак не ўсе аптаваныя выехалі: многія заставаліся і зноў прымалі савецкае грамадзянства, асабліва калі ад ужо ад'ехаўшых сталі паступаць паведамленні аб нялёгкім жыцці на «новай старай» радзіме. Да 1923 г. у настроях аптантаў адбыўся пералом: ад'язджаць ужо не жадалі, многія пачалі вяртацца [5, ф. 7, воп. 1, спр. 62, арк. 34].

Палітыку савецкай улады ў адносінах да аптантаў раскрываюць цыркуляры і распараджэнні, якія выдаваліся адміністрацыйным аддзелам (аддзелам упраўлення) Мінскага губвыканкама. Аддзел упраўлення знаходзіўся ў падпарадкаванні НКУС БССР (ССРБ), з'яўляўся выканаўчым апаратам Прэзідыума выканкама па правядзенні ў жыццё адміністрацыйных мерапрыемстваў органаў улады. У абавязкі аддзела ўпраўлення таксама ўваходзілі улік насельніцтва, рэгістрацыя замежных грамадзян, ізаляцыя «варожых элементаў», арганізацыя прымусовых прац для асоб. У яго склад былі ўключаны аддзелы ЗАГС і замежнае аддзяленне, у якім былі зарэгістраваныя аптанты, якія атрымалі замежнае грамадзянства [5, ф. 34, воп. 1, спр. 35, арк. 78].

У канцы 1922 г. палітыка савецкай улады ў адносінах да аптантаў стала больш жорсткай. Аптантаў часта сталі падазраваць у варожых дзеяннях на карысць польскай дзяржавы. Быў узяты курс на абавязковы і хуткі выезд іх па-за межы БССР (ССРБ). Раней аптанты накіроўваліся на радзіму разам з бежанцамі, якім па міжнародных дагаворах адводзілі эшалоны для выезду пасля папярэдняга запісу [5, ф. 39, воп. 1, спр. 345, арк. 16].

Цяпер для паскарэння адпраўкі аптантаў улады распачалі іх прымусовае высяленне. 4 кастрычніка 1922 г. на аснове Дэкрэта СНК ад 29 жніўня 1921 г. была прынята абавязковая пастанова «Аб высяленні аптантаў па-за межы ССРБ» [5, ф. 6, воп. 1, спр. 1, арк. 78]. Было вырашана абавязаць грамадзян, якія аптавалі польскае грамадзянства, выехаць па-за межы рэспублікі ў месячны тэрмін, г. зн. да 15 лістапада 1922 г. Таксама прызнавалася неабходным абавязаваць аптантаў, якія не атрымалі аптацыйных пасведчанняў, з'явіцца за іх атрыманнем да 10 лістапада ў аддзел упраўлення. Тэрмін знаходжання 1,5 гады для палякаў адлічваўся для аптантаў, якія не атрымалі своечасова аптацыйных пасведчанняў, з моманту задавальнення хадайніцтва аддзелам упраўлення [5, ф. 34, воп. 1, спр. 134, арк. 14].

Прэзідыум губвыканкама 4 мая 1923 г. выдаў распараджэнне аб недапушчальнасці пакідання на працы ў дзяржаўных установах аптантаў. Аднак многія ўпраўленні знаходзілі розныя шляхі, каб адцягнуць звальненне. Было ўсталявана, што большасць хадайніцтваў аб адтэрміноўках складаюцца ў дзяржаўных установах у асабістых інтарэсах аптантаў [5, ф. 6, воп. 1, спр. 1, арк. 54].

Па распараджэнні НКЗС РСФСР консульскі аддзел пры пасольстве Польшчы першапачаткова мог толькі прымаць заявы аб аптацыі, але не меў права ажыццяўляць аптацыю ці разглядаць аптацыйныя справы на месцы. Самастойная аптацыя была дазволена тэлеграмай намесніка НКУС. Пытанне аб дэцэнтралізацыі аптацыі канчаткова было вырашана да 16 лютага 1922 г. [5, ф. 34, воп. 1, спр. 30, арк. 13]. Аддзелы ўпраўлення гарадскіх і павятовых выканкамаў і валасныя выканкамы павінны былі «безагаворачна» прымаць заявы і дакументы асоб, якія аптуюцца ў польскае грамадзянства, не ўваходзячы ў абмеркаванне пытання аб дастатковасці асноў для аптацыі. Прынятыя заявы ў трохдзённы тэрмін накіроўваліся ў аддзел упраўлення.

Права на выбар польскага грамадзянства мелі былыя грамадзяне Расійскай імперыі, якія дасягнулі 18 гадоў, былі запісаны ў кнігі сталага народанасельніцтва Царства Польскага ці запісаны ў мясцовай гміне ці вёсцы, якія ў той час уваходзілі ў склад Польшчы (на 30 красавіка 1921 г.); асобы, якія дасягнулі 18 год, знаходзяцца на тэрыторыі Расіі ці Украіны, могуць даказаць сваё паходжанне ад удзельнікаў барацьбы за незалежнасць Польшчы ў 1830—1865 гг. ці з'яўляюцца нашчадкамі асоб, якія не далей як у трэцім пакаленні пражывалі на тэрыторыі Рэчы Паспалітай у дзевяці прывіслінскіх (Варшаўская, Калішская, Келецкая, Ломжынская, Люблінская, Петракоўская, Плоцкая, Радамская, Сувалкская), Кіеўскай, Валынскай, Падольскай, Курляндскай, Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Віцебскай губернях [5, ф. 40, воп. 1, спр. 217, арк. 19].

Неабходна было даказаць, што чалавек, які прэтэндуе на грамадзянства Польшчы, быў членам польскага грамадства, навучаўся ў польскай навуковай установе, сваёй дзейнасцю, ужываннем польскай мовы як размоўнай і выхаваннем сваіх нашчадкаў мог «засведчыць сваю прыхільнасць да польскай нацыі». У доказ сваёй прыналежнасці да польскай нацыі неабходна было прадставіць аптацыйнаму аддзелу, акрамя дакументаў, якія вызначаюць паходжанне, таксама падпіску трох сведкаў-палякаў аб тым, што заяўнік сапраўды адпавядае ўсім патрабаванням. Ад прадстаўлення такой падпіскі вызваляліся асобы, якія маглі даказаць сваю дзейнасць у польскіх грамадскіх арганізацыях. У такіх паручальніцтвах падкрэслівалася благанадзейнасць кандыдата, яна часта пацвярджалася непартыйнасцю чалавека, у ёй указвалася на выкананне кандыдатам «польскіх звычаяў». Часта пасведчанні аб прыналежнасці чалавека да польскай нацыянальнасці выдаваў настаяцель касцёла [5, ф. 34, воп. 1, спр. 56, арк. 68].

У інструкцыі аб парадку ажыццяўлення аптацыі грамадзянства Польшчы адзначалася, што «бяспрэчнымі дакументамі», якія даюць права на аптацыю, лічуцца дакументы, выданыя да рэвалюцыі 1917 г. Наадварот, «недастатковымі для доказу права аптацыі» лічыліся дакументы, выданыя пасля рэвалюцыі. Гэтыя абставіны тлумачыліся тым, што да рэвалюцыі «не было магчымасці думаць аб узнікненні на той ці іншай тэрыторыі Расійскай імперыі асобнай дзяржавы» [5, ф. 34, воп. 1, спр. 56, арк. 3]. «Прыхільнасць да польскай нацыі» патрабавалася даказаць дакументальна. Сярод дакументаў, якія даказвалі пражыванне на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай, маглі быць саслоўныя граматы, пашпарты, пасведчанні аб вайсковай павіннасці, пасведчанні навучальных устаноў, гандлёвыя дакументы [5, ф. 34, воп. 1, спр. 56, арк. 5].

Асобы, якія жадалі апціраваць польскае грамадзянства, падавалі заяву з дадаткам дакументаў аб выбары польскага грамадзянства консулу Польшчы на працягу года, пачынаючы з 30 красавіка 1921 г. Для асоб, якія жылі на Каўказе і ў Азіяцкай частцы Расіі, гэты тэрмін быў падоўжаны да 15 месяцаў. Такую ж заяву падавалі адначасова ў аддзел упраўлення па месцы жыхарства [5, ф. 34, воп. 1, спр. 96, арк. 123].

Дакументамі, якія даказвалі права на аптацыю, з'яўляліся пашпарт, метрычная выпіска аб нараджэнні, а ў выпадку іх адсутнасці — пасведчанне аб праходжанні вайсковай павіннасці, адукацыі, фармулярны спіс. Да заявы аптанты павінны былі прыкласці анкету ў двух экземплярах, складзеную па вызначанай форме, дзве фотакарткі заяўніка, членаў сям'і, у тым ліку дзяцей узростам старэйшых за 14 год.

Матэрыялы жадаючых апціраваць польскае грамадзянства прымалі мясцовыя органы ўлады, затым яны паступалі ў аптацыйны аддзел польскага прадстаўніцтва, якое выдавала адпаведныя пасведчанні. Аднак пасведчанні польскага прадстаўніцтва аб прызнанні таго або іншага чалавека грамадзянінам Польшчы не азначалі канца аптацыі да прад'яўлення НКУС [5, ф. 34, воп. 1, спр. 56, арк. 23].

У аддзеле ўправлення выканкама справа аптанта разглядалася загадчыкам аддзела, які прымаў канчатковае рашэнне аб дастатковасці ці недастатковасці дакументаў для прызнання за заяўнікам правоў да аптацыі польскага грамадзянства. Затым заява з дакументамі ў трохдзённы тэрмін паступала ў аддзел агульных спраў НКУС, які ў месячны тэрмін са дня паступлення паведамлення польскага прадстаўніцтва аб прыняцці той або іншай асобы ў польскае грамадзянства абавязаны быў разгледзець заяву аб аптацыі і паведаміць НКЗС аб прынятым рашэнні [5, ф. 34, воп. 1, спр. 81, арк. 12].

Затым дакументы паступалі ў аддзел упраўлення выканкама, які прымаў канчатковае рашэнне па пытанні аб выездзе ў Польшчу той або іншай асобы, прынятай у польскае грамадзянства. Калі савецкі бок быў згодны, то прадстаўнік польскай дэлегацыі выдаваў аптанту пасведчанне аддзела ўпраўлення выканкама аб атрыманні польскага грамадзянства, якое давала права на атрыманне польскага пашпарта. У выпадку станоўчага рашэння грамадзянін быў абавязаны ў шасцімесячны тэрмін са дня выдачы аптацыйнага пасведчання пакінуць межы БССР (ССРБ). У выпадку адмоўнага рашэння дакументы аптанта вярталіся ў НКЗС з заключэннем аб прычынах адмовы [5, ф. 34, воп. 1, спр. 56, арк. 25].

Многія з аптантаў звярталіся за дапамогай да польскай дэлегацыі ў Змешанай камісіі па рэпатрыяцыі, так як на працягу двух тыдняў, якія ім давалі на зборы мясцовыя ўлады, аптанты не маглі ліквідаваць сваю маёмасць і не мелі сродкаў на выезд. У сваім звароце да аптантаў 16 лютага 1922 г. старшыня поль-

скай камісіі папярэджваў, каб яны заўчасна не ліквідавалі маёмасць, бо Савецкая дзяржава мае цяжкасці ў транспарце і падрыхтоўка ад'езду ў Польшчу займе пэўны час [5, ф. 34, воп. 1, спр. 27, арк. 11]. Да канца 1921 г. была рэпатрыявана на радзіму асноўная маса польскіх бежанцаў. У далейшым разам з бежанцамі вялася рэпатрыяцыя аптантаў, якая працягвалася да восені 1923 г.

З сакавіка 1923 г. прадстаўнік Польшчы па справах аптацыі звярнуўся да старшыні выканкама з лістом [5, ф. 34, воп. 1, спр. 27, арк. 44—47]. У шэрагу пісьмовых і вусных заяў, якія паступалі ў польскае прадстаўніцтва, указвалася, што мясцовыя ўлады на аснове рашэння НКУС РСФСР ад 23 снежня 1922 г. з польскіх рэпатрыянтаў і аптантаў бралі падпіску. Польскія грамадзяне гэтым дакументам бралі на сябе адказнасць выехаць за межы БССР (ССРБ) на працягу двух тыдняў. У некаторых выпадках палякам пагражалі прымусовай высылкай з канфіскацыяй маёмасці [5, ф. 34, воп. 1, спр. 184, арк. 84].

Старшыня выканкама ў сваім лісце ад 13 сакавіка 1923 г. на імя ўпаўнаважанага Польскай рэспублікі па справах аптацыі і рэпатрыяцыі паведамляў, што распараджэннямі ўлады не прадугледжваліся высяленне рэпатрыянтаў, а таксама канфіскацыя маёмасці аптантаў, якія не выедуць у 6-месячны тэрмін са дня выдачы аптацыйнага пасведчання. Адносна аптантаў, якія за гэты час не змаглі выехаць, указвалася, што яны могуць падаць заявы аб пераходзе ў падданства БССР (ССРБ) або павінны на працягу двух тыдняў са дня сканчэння 6-месячнага тэрміну выехаць за межы рэспублікі. 25 мая 1923 г. прадстаўнік Польшчы па справах аптацыі ў лісце, накіраваным у выканкам, указваў на неабходнасць усталявання дакладнага тэрміну, на працягу якога выканкамы павінны былі выдаваць візы аптантам, якія падалі заявы аб выездзе. Польскі бок звяртаў увагу на тое, што трохдзённы тэрмін для атрымання візы быў бы пажаданым для аптантаў, якія ліквідавалі маёмасць і былі зацікаўлены ў хуткім ад'ездзе [5, ф. 15, воп. 1, спр. 124, арк. 56].

У ходзе працэсу аптацыі польскага грамадзянства сур'ёзныя перашкоды ўзнікалі ў маладых людзей прызыўнага ўзросту. На аснове загада Рэвалюцыйнага ваеннага савета Рэспублікі і НКУС ад 13 лістапада 1921 г. выхадцы з мясцінаў, якія адыходзілі па Рыжскім мірным дагаворы да Польшчы, жадаючыя выехаць на радзіму, павінны быць звольнены з ваеннай службы ў парадку аптацыі па прадстаўленні неабходных дакументаў (арт. IV Дамовы аб рэпатрыяцыі) На практыцы гэтае права рэпатрыянтаў часта парушалася. У Дамове аб рэпатрыяцыі, якая была падпісана 24 лютага 1921 г. паміж Расіяй і Украінай, з аднаго боку, і Польшчай — з другога, указвалася аб спыненні судовага, адміністрацыйнага, дысцыплінарнага пераследу грамадзянскіх палонных, інтэрнаваных, закладнікаў, бежанцаў, эмігрантаў і ваеннапалонных. Рэпатрыяцыя з'яўлялася добраахвотнай. Для выканання дамовы былі створаны дзве змешаныя камісіі: у Маскве і ў Варшаве. Кожная змешаная камісія складалася з двух дэлегацый: старшыні, двух намеснікаў і трох членаў дэлегацый. У кампетэнцыю камісіі ўваходзілі выяўленне асоб, якія падлягалі рэпатрыяцыі, назіранне за іх рэгістрацыяй, аказанне матэрыяльнай дапамогі. Змешаныя камісіі павінны былі прад'явіць у адпаведныя цэнтральныя ўстановы спісы асоб, якія падлягалі рэпатрыяцыі. Дамова прадугледжвала, што ў ліку першых павінны былі вяртацца на радзіму грамадзянскія палонныя, інтэрнаваныя і закладнікі [2, с. 626].

У ліпені 1921 г. Беларускае ўпраўленне па эвакуацыі, яго павятовыя і раённыя органы адкрылі рэгістрацыю бежанцаў і аптантаў з заходніх губерняў, якія адыходзілі да Польшчы. Рэгістрацыя была адкрыта: 1) для бежанцаў, якія жадалі эвакуіравацца на радзіму; 2) грамадзян, якія паходзілі з Варшаўскай, Калішскай, Келецкай, Люблінскай, Ломжынскай, Плоцкай, Петракоўскай, Радамскай, Сядлецкай, Холмскай, Сувалкскай (Сувалкскі і Аўгустоўскі паветы), Гродзенскай (акрамя г. Гродна і Гродзенскага павета), Мінскай (Пінскі і Навагрудскі паветы), Валынскай (Уладзіміра-Валынскі, Ковельскі, Дубенскі, Роўненскі, Крамянецкі, Луцкі і Астрожскі паветы) губерняў; 3) грамадзян, якія маюць дакументальныя доказы таго, што яны да 1 жніўня 1914 г. пастаянна пражывалі ў адной з пералічаных вышэй мясцовасцей і падчас Першай сусветнай, Грамадзянскай і польска-савецкай войн самі выехалі з названых тэрыторый ці былі выселены распараджэннем грамадзянскіх ці ваенных улад. Да бежанцаў прыраўноўвалі і былых ваеннапалонных Першай сусветнай вайны [5, ф. 39, воп. 2, спр. 17, арк. 18].

Працэс аптацыі польскага грамадзянства на тэрыторыі Беларусі ў 1921—1923 гг. суправаджаўся праблемамі з пошукамі неабходных дакументальных доказаў сваёй прыналежнасці да польскай нацыянальнасці: за час ваеннага ліхалецця значная частка крыніц была пашкоджана ці зусім знікла. Прадстаўнікі НКЗС і НКУС БССР (ССРБ) часта звярталіся па дадатковыя тлумачэнні ў цэнтральныя органы ў Маскве. Дадавала вастрыні сітуацыі слабое матэрыяльнае забеспячэнне аптантаў, якія не мелі сродкаў ажыццявіць транспарціроўку сваёй сям'і і маёмасці. Асноўная хваля выезду аптантаў прыходзіцца на 1921—1922 гг. Выязджалі не толькі палякі, але і беларусы, рускія, яўрэі і немцы. У канцы 1922 г. палітыка савецкай улады ў адносінах да аптантаў стала больш жорсткай. Аптантаў пачалі падазраваць у варожых дзеяннях на карысць польскай дзяржавы. Быў узяты курс на іх абавязковы і хуткі выезд за межы БССР (ССРБ).

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Бабков, А. М. Деятельность Белорусского управления по эвакуации населения (январь—август 1921 г.) / А. М. Бабков // Изв. Гомел. гос. ун-та имени Ф. Скорины. Сер. «Гуманитарные науки». — 2011. — № 5 (68). — С. 9—16.
2. Документы внешней политики СССР. В 24 т. Т. 3: 1 июля 1920 г. — 18 марта 1921 г. / редкол.: Г. А. Белов [и др.]. — М., 1959. — 723 с.
3. Кириллова, Е. А. «Всех уволить немедленно»: оптанты на советской службе (из истории коммунального хозяйства Петрограда начала 1920-х гг.) / Е. А. Кириллова // Новый ист. вестн. — 2012. — № 4 (34). — С. 19—37.
4. Мархлевский, Ю. Война и мир между буржуазной Польшей и пролетарской Россией / Ю. Мархлевский. — М.: Госполитиздат, 1921. — 42 с.
5. Нац. архіў Рэсп. Беларусь.
6. Ольшанский, П. Н. Рижский мир. Из истории борьбы Советского правительства за установление мирных отношений с Польшей (конец 1918 — март 1921 г.) / П. Н. Ольшанский. — М.: Наука, 1969. — 260 с.
7. Островский, Л. К. Поляки в Западной Сибири в конце XIX — первой четверти XX века / Л. К. Островский. — Новосибирск: НГАСУ, 2016. — 808 с.
8. Радек, К. Третий год борьбы Советской республики против мирового капитала / К. Радек. — М.: Госполитиздат, 1921. — 26 с.
9. Archiwum aktów nowych.
10. Gostyńska, W. Stosunki polsko-radzieckie. 1918— 1919 / W. Gostyńska. — Warszawa, 1981.— 397 s.
11. Kumaniecki, J. Po traktacie ryskim / J. Kumaniecki. — Warszawa: Książka i wiedza, 1971. — 282 s.
12. Materski, W. Polska a ZSSR. 1923—1924 / W. Materski. — Wrocław, 1981. — 380 s.


Артыкул паступіў у рэдакцыю 24 кастрычніка 2022 г., дапрацаваны ў сакавіку 2023 г.